*Д.С. БУЦІН*

# ПАХОДЖАННЕ КОПНАГА СУДА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Анализируется проблема названия и происхождения копного суда на белорусских землях ВКЛ. Выдвигается авторская теория о вечевом происхождении копы при наличии соседско-территориальной солидарности в крестьянской среде, не исключая возможности определенного влияния на суд правовой традиции и практики времен Русской Правды.

The article analyzes the problem of the name and origin of the Kopny court in the Belarusian lands of the GDL on the basis of the study of written sources and literature. The author proposes the theory of the veche origin of kapa in conditions of neighborly and territorial solidarity among peasants. The author admits the possibility of the court being under a certain influence of the legal tradition and practice of the Russkaya Pravda times.

Сучаснасць і будучыня кожнага чалавека, народа і дзяржавы самым цесным чынам звязаны з іх гістарычным лёсам. Распрацаваныя традыцыі права з’яўляюцца яскравым прыкладам таго, што ў народнай самасвядомасці існуе разуменне сваёй адметнасці, і праз незалежную прававую традыцыю той ці іншы народ імкнецца сцвердзіць свае права на самастойнае і лепшае існаванне. Беларускае звычаёвае права адрознівалася ад традыцый і практыкі не толькі сваіх далёкіх суседзяў, але і ад прававых нормаў рускага і ўкраінскага этнасаў, не кажучы ўжо аб польскім і літоўскім. Дзейнасць копаў на Беларусі паказвае даволі неблагую прававую адукаванасць і незалежнасць не толькі прывілеяваных колаў грамадства, але і простага люду, які з дапамогай капы імкнуўся да вырашэння сваіх паўсядзённых спраў і праблем. Праца копнікаў паказвае тую самастойную пазіцыю, якую на працягу ўсёй нашай гісторыі займаў звычайны чалавек, а вышэйшыя слаі дзяржавы ў некаторых выпадках як садзейнічалі яму, так і стараліся перашкаджаць на гэтым даволі складаным шляху. Копныя сходы дзейсна дапамагалі людзям у іх няроўным супрацьстаянні з шляхтай, уладамі і дзяржаўным апаратам. І дарэчы, асабліва ў сваёй пачатковай дзейнасці, капа даволі эфектыўна абараняла свае саслоўныя інтарэсы перад больш значнымі станамі краіны. Але асноўнай мэтай і задачай гэтых судоў было вырашэнне ўсялякіх спрэчак непасрэдна ў межах свайго сялянскага саслоўя, разгляд бягучых жыццёвых і гаспадарчых праблем і пытанняў, што некаторы раз з’яўлялася не менш цяжкай справай, чым адносіны з вышэйшымі коламі грамадства.

Звычаі, традыцыя і практыка капы абапіраліся не на нейкія распрацаваныя дзяржавай прававыя і юрыдычныя механізмы і нормы, а на народную мудрасць і на магутнейшую маральную павагу, з якой усе людзі ставіліся да копных мужоў і да ўсяго сходу. З-за гэтага копныя суды, што пачалі фарміравацца прыкладна на працягу XI–XIII стст., праіснавалі аж да канца XVIII ст. Такая доўгая іх дзейнасць можа тлумачыцца тым, што для ўсяго насельніцтва, не толькі сялянскага, яны былі прыкладам сапраўднай шчырасці, помнікам жывой і хуткай чалавечай думкі, якая была непахіснай і непрадузятай у адносінах да кожнага жыхара княства. Дзейнасць капы дае нам добрую магчымасць скласці псіхалагічны партрэт сярэднявечнага продка сучаснага беларуса, выявіць яго ментальныя арыентацыі, з’яўляецца значнай крыніцай для вывучэння гісторыі паўсядзённасці, мікра- і псіхагісторыі нашай старасветчыны.

Сучаснае права і судовы лад маюць свае парасткі ў гістарычнай мінуўшчыне. І ранейшая пісьмовая прававая, і судовая традыцыя, і сённяшнія законы нараджаюцца са старажытнага звычаёвага права, яскравым прыкладам якога на беларускіх землях з’яўлялася копнае. Судаводства капы было своеасаблівым папярэднікам усіх астатніх судовых устаноў і ўвогуле юрыдычнай практыкі на дадзенай тэрыторыі. Даследуючы гістарычныя традыцыі копнікаў, нельга не адзначыць, колькі пазітыўнага і карыснага яны ўнеслі ў будучую судова-працэсуальную тэорыю і практыку. Гэта дае магчымасць сцвярджаць, што на нашых землях ужо ў тыя старадаўнія часы існавала самастойная прававая сістэма. Шмат рэчаў з сучаснай юрыдычнай справы зарадзілася менавіта ў гэтыя далёкія стагоддзі. Дадзенае палажэнне адлюстроўвае практычны ўплыў капы на грамадства, а разам з тым падкрэслівае магчымасць выкарыстання некаторых дадатных рысаў копных традыцый і ў сённяшняй судовай практыцы.

Копныя суды ўзніклі ў старажытныя часы, і ў іх дзейнасці доўгі час маглі захоўвацца шматлікія магічныя паганскія абрады, якія выконвалі жрацы-крэвы аж да сярэдзіны XV ст.[1] На карысць гэтай версіі сведчыць і тое, што ў ходзе дзейнасці капы падчас самога судовага працэсу нярэдка праводзіліся некаторыя магічныя і язычніцкія абрады (кіданне шапкі, прыстаўленне нагі, прысяга і г. д.)[2]. Раней галоўнымі месцамі збору людзей былі старажытныя язычніцкія свяцілішчы – капішчы. Месцы збору капы ў XVI–XVII стст. маюць у крыніцах вельмі падобную назву – капавішчы (копішчы)[3]. Не выключана, што ў некаторых мясцовасцях копы традыцыйна працягвалі збірацца якраз на месцах старадаўніх свяцілішчаў[4]. Аб гэтым у сярэдзіне XIX ст. прыгадваў і Я. Тышкевіч, бо нарадзіўся копны суд, на яго думку, у сівой паганскай мінуўшчыне[5]. Аднак даследчык неабгрунтавана атаясамліваў язычніцкія капішчы з копнымі копішчамі, якія, па яго меркаванню, існавалі ўжо ў XI ст.

Сучасны беларускі філосаф В. Евароўскі параўноўвае дзейнасць капы з dy gegenote і opole Польскай Праўды XIII ст., цэнтурыямі Салічнай Праўды і Дэкрэта Хлотара I, раннефеадальным

нарвежскім bygdir, верв'ю Рускай Праўды, некаторымі артыкуламі Паліцкага Статута. Даследчык робіць выснову аб моцным падабенстве дадзеных прававых устаноў і інстытутаў, а тым самым аб магчымасці адзінства іх паходжання[6]. Гэтае сцвярджэнне дастаткова слушнае, але да яго трэба ставіцца з пэўнай асцярогай, каб не адбылося атаясамлення капы з дадзенымі хоць і падобнымі, але ж самабытнымі юрыдычнымі і судовымі традыцыямі і практыкамі, якія шмат у чым адрозніваліся ад копных.

Ускосныя доказы аб існаванні капы знаходзяцца ў адным з актаў Драгічынскага земскага суда, які датуецца 12 сакавіка 1481 г.[7] Пісьмова зафіксавана капа была ўпершыню 6 красавіка 1499 г. у суднай грамаце вялікага князя літоўскага Аляксандра, але тут яна завецца «сокам»[8]. Непасрэдна тэрмін «капа» сустракаецца на старонках кнігі судных спраў Метрыкі ВКЛ у справе, якая адбылася 20 лютага 1520 г. У дакуменце распавядаецца наступнае: «Людзі яго не жадаюць выходзіць на капу разам з маімі людзьмі, якія перад гэтым здаўна хажывалі, калі каму якая шкода стане»[9]. Адсюль можна зрабіць выснову, што копныя сходы практыкаваліся нашмат раней, прынамсі на працягу XV ст. Першае заканадаўчае ўпамінанне аб капе знаходзіцца ў загадзе Жыгімонта Старога ад 29 верасня 1529 г., што тычыўся часу ўвядзення ў дзейнасць I Статута ВКЛ[10]. У Статуце капа разглядалася ў якасці шляхецкага або пазямельнага суда, які праводзіўся на межах спрэчных тэрыторый. У дакументах, якія выйшлі з дзяржаўнай канцылярыі ў пачатку XVI ст., капой таксама нярэдка называлі і судовыя следства па шляхецкіх спрэчках[11]. Але яшчэ ў Рускай Праўдзе XI ст. ёсць намёкі на дзейнасць гарачай капы: «…а след гонить с чюжими людьми и с послухы»[12].

Само слова «капа» мае старажытны ўсходнеславянскі падмурак і падобна да аднакаранёвага «капіцца» – гэта значыць збірацца, грамадзіцца. У старабеларускай мове тэрмін «капа» меў некалькі значэнняў. Сярод іх – азначэнне мяжы пэўнай тэрыторыі. Як сведчаць гістарычныя крыніцы, капой звалася мяжа тэрыторыі пэўнай абшчыны ці сяла. Капой называўся і сход людзей, якія збіраліся на пэўным месцы, часцей за ўсё менавіта на гэтай рысе. Да сённяшняга дня выраз «капец» у беларускай мове мае значэнне канец, канчатак, завяршэнне[13]. Граніца паміж землямі розных сельскіх абшчын абазначалася спецыяльнымі межавымі знакамі – «капцамі»[14]. Капа ў якасці адзінкі вылічэння ў ВКЛ раўнялася 60. Капа тое ж самае, што куча, сход, натоўп[15]. Такім чынам, назва копнага суда сінанімічна найменням: народны, грамадскі, і нават сялянскі, сельскі суд. У судовых актах капа часта выступае як «немалая сходка людзей»[16]. Найбольш распаўсюджанай назвай судовых збораў у крыніцах, акрамя ўласна капы, з'яўляюцца «грамада», «грумда», «зграмаджэнне», «сход», «з'езд», «веча», «сойм», «сок», «суд гайны», «след»[17]. Шэраг гэтых тэрмінаў сведчыць не толькі аб дасканаласці тагачаснай «рускай» (старажытнабеларускай) мовы, але і адлюстроўвае спосаб, які быў выкарыстаны падчас арганізацыі суда. Сходка блізкіх суседзяў – сход; зборка людзей аколічных – з'езд; паказвае месца пасяджэння – суд гайны; адзначае методыку працы – след, сок. У адным дакуменце могуць паралельна сустракацца розныя назвы адной і той жа судовай установы. У некаторых мясцовасцях, напрыклад у Слуцкім княстве, капа звалася «купа»[18].

Галоўнымі відамі копаў былі «гарачая» – калі патрабаваліся хуткія дзеянні, накіраваныя на выкрыццё злачынства; «вялікая», «вальная», «галаўная» – найбольш шматлікія сходы; «завітая», «прысяжная», «святая» – завяршальныя копы. Існавалі «малыя» (вясковыя), «вялікія» (сельскія) і «генеральныя» (валасныя) копныя зборы.

Першаснымі і найбольш складанымі з'яўляюцца пытанні паходжання і нарматыўнай дзейнасці копных сходаў. Аб пачатках дадзенай установы амаль нічога не вядома ні з летапісаў, ні з далейшых пісьмовых дакументальных або якіх-небудзь іншых крыніц. Але ж можна вылучыць шэсць асноўных тэорый узнікнення копных судоў, што, дарэчы, заснаваны не на дакладных навуковых фактах, а хутчэй на логіцы гістарычнага развіцця.

Першай па сваёй папулярнасці з'яўляецца тэорыя, якой прытрымліваўся шэраг расійскіх навукоўцаў другой паловы XIX ст. (прыхільнікі тэзы адзінага і суцэльнага рускага народа і культуры), – паходжанне тэрміналогіі і практыкі копных сходаў з традыцыі народных судоў Рускай Праўды і вечавой актыўнасці. Прыхільнікам гэтай гіпотэзы з'яўляўся архіварыус Віцебскага і Віленскага цэнтральнага архіваў старажытных грамат І. Спрогіс. Тэорыя базіруецца на адзінстве некаторых тэрмінаў, якія ўжываліся як у судаводстве народных судоў Русі, так і ў практыцы капы. Такімі тэрмінамі ў копным судаводстве былі: «муж», «ліцэ», «след», «пераслух», «прысяжны ліст», «заводца», «сачыць». А ў папярэднім яму народным судзе – «муж», «ліцэ», «след», «послух», «рота», «свод», «отсочыць»[19].

Аднак апрача першых трох тэрмінаў (муж – суддзя, ліцэ – уліка і след, якія сапраўды ўжываліся ў практыцы абедзвюх судовых устаноў) астатнія або не мелі адзіных каранёў, або мелі розны лексічны і юрыдычны змест. Прыкладам адзінага сэнсу, але розных каранёў з'яўляюцца тэрміны «рота» і «прысяжны ліст» – абодва з іх азначалі прысягу. Прыкладам жа разыходжанняў юрыдычнага значэння з'яўляюцца тэрміны «послух» – асоба, якая нешта ведала аб злачынстве (сведка), і «пераслух» – той момант у копным працэсе, калі справа з-за невыкрыцця вінаватых і адсутнасці пэўнай інфармацыі адкладвалася да часу выяўлення слядоў злачынцы шляхам далейшай следчай працы. Слова «свод», паводле народных судоў Рускай Праўды, азначала канфрантацыю вінаватага з той асобай, ад якой ён

атрымаў крадзеную рэч, а тэрмін «заводца» тычыўся той асобы, ад якой наогул паходзіла дадзеная рэч. Урэшце слова «отсочыць» у Рускай Праўдзе мае значэнне адвесці ад сябе падазрэнне або след, а «сачыць» у копным працэсе з'яўлялася раўназначным слову «шукаць». Як бачым, апрача азначэнняў муж, ліцэ і след, астатнія маюць зусім іншы змест, тым самым вельмі цяжка выводзіць тэрміналогію і традыцыю копных судоў з часоў Рускай Праўды[20].

Такім чынам, станаўленне капы І. Спрогіс выводзіў з эвалюцыі вечавога ладу і традыцыі Рускай Праўды часоў Яраслава Мудрага. Калі з першым складнікам у выглядзе веча можна пагадзіцца, то гіпотэза аб вырашальным уплыве заканадаўства Рускай Праўды на зараджэнне капы не зусім пераканаўчая. Яго пункт гледжання дастаткова спрэчны, які адразу выклікае пытанне: чаму ж тады практыка копных судоў назіраецца амаль выключна на тэрыторыі Беларусі і толькі ў некаторых раёнах Украіны, у той час калі дзейнасць Рускай Праўды мела распаўсюджанне на шмат шырэйшых абшарах? Зразумела, гэты факт можна патлумачыць тым, што на тагачасных беларуска-ўкраінскіх землях не існавала той моцнай цэнтральнай улады, як на ўласна рускай тэрыторыі, што дало магчымасць гэтаму рэгіёну захаваць сапраўды народную прававую ўладу, аднак вельмі неперaканаўча выглядае дадзенае тлумачэнне.

Таму трэба паставіць пад сумненне тэорыю аб паходжанні копаў з практыкі народных судоў на Русі. Беларускі даследчык гісторыі судовай установы М. Шкялёнак першым найбольш аргументавана выказаў меркаванні аб штучнасці, недасканаласці, палітычнай і ідэалагічнай прыцягнутасці дадзенай гіпотэзы[21].

Аднак ёсць і пэўныя доказы некаторых іншых даследчыкаў на яе карысць. Практыку пагоні следу ў законе Яраслава Г. Дземчанка атаясамліваў з гарачай капой[22]. Бачыў у копным судзе эвалюцыю старажытнарускай верві М. Любаўскі[23]. Такім чынам, некаторыя навукоўцы выказвалі меркаванне пра паходжанне капы непасрэдна ад старажытных народных судоў Яраслава, а другія адзначалі толькі пэўны ўплыў праўных звычаяў часоў Рускай Праўды на фарміраванне будучага інстытута копнага сходу як з'явы. На наш погляд, больш слушным з'яўляецца апошняе меркаванне. Таму парасткі капы назіраюцца ўжо ў XI–XIII стст., а канчатковае яе станаўленне адбываецца недзе ў XV–XVI стст.

Паводле наступнай тэорыі, прыхільнікам якой з'яўляўся беларускі гісторык і палітык М. Шкялёнак, копныя суды бяруць свой пачатак з трансфармацыі і эвалюцыі традыцый і практыкі старажытнага беларускага вечавога ладу, амаль асобна ад уплыву дзейнасці артыкулаў Рускай Праўды. Меркаванне мае больш глыбокія навуковыя асновы і высвятляе не толькі сам працэс фарміравання копаў, але і іх юрыдычныя асаблівасці. Найбольш старажытнай грамадскай формай беларускага народнага самакіравання было веча, якое на пачатку свайго існавання мела ўсю паўнату ўлады: заканадаўчую, судовую і выканаўчую. У доўгім працэсе барацьбы князёў з вечам першыя паступова адваявалі ў народнага сходу ўсе тры гэтыя галіны ўлады. У выніку кампетэнцыя веча зменшылася, але цалкам не знікла. З таго часу, калі ў яго руках засталася толькі судовая ўлада, якая абмяжоўвалася рэгуляваннем штодзённага жыцця грамады і мясцовым судом, веча перастала быць небяспечным і шкодным інстытутам у адносінах да княжацкай улады. Яно стала вельмі пажаданай і карыснай установай для яе. Менавіта ў гэтай форме народныя зборкі, якія былі пазбаўлены палітычных магчымасцей былога веча, зрабіліся аднымі з эфектыўнейшых інстытутаў у сэнсе ўзмацнення і падтрымання маральных асноў у грамадстве. Яны і сталі пачаткам будучых копаў. Тым самым назіраецца факт незвычайнай сілы і жыццяздольнасці беларускага старадаўняга веча, якое не загінула бясследна, як у іншых народаў, у тым ліку і ў нашых суседзяў. Яно перарадзілася ва установу, што адыграла вялікую пазітыўную ролю ў прававым, гаспадарчым і культурным жыцці беларускага народа, і канчаткова перастала існаваць толькі ў канцы XVIII ст.[24]

Трэцяя разглядаемая намі тэорыя ў храналагічных адносінах была высунута першай і з'явілася яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Яе аўтарам быў кіеўскі прафесар М. Іванішаў. Ён выказаў думку аб абшчынным паходжанні капы з часоў, калі славянскія плямёны яшчэ не былі аб'яднаны ў дзяржаву пад уладай адзінага гаспадара[25]. Аднак у сваёй жа працы аўтар піша аб тым, што ніводная гістарычная крыніца не пацвярджае дадзеную пазіцыю. Аўтар не бачыў розніцы паміж грамадой і капой. З гэтай прычыны нельга лічыць наступную гіпотэзу навукова абгрунтаванай. Фактычна яна з'яўляецца выключна ўласным меркаваннем згаданага даследчыка.

Наступная тэорыя належыць карыфею вывучэння гісторыі ВКЛ М. Любаўскаму, які выводзіў пачаткі копаў з наяўнасці кругавой парукі і эвалюцыі верві (абшчыны) у асяроддзі сельскага насельніцтва[26]. Аднак, згодна з літаратурнымі данымі, мы ведаем, што капа дзейнічала ў асноўным на заходніх і цэнтральных беларускіх землях, для якіх была не вельмі характэрна абшчынная традыцыя жыцця. М. Любаўскі мяркуе, што гэта кругавая парука ўсталявалася ў момант заканчэння існавання родавых адносін і зараджэння суседска-тэрытарыяльных, яшчэ да з'яўлення першых дзяржаўных утварэнняў. Але тады не зусім зразумела, перад кім грамада несла дадзеную паруку, а ў выпадку невыканання яе палажэнняў – перад кім трымала адказнасць, бо ў гэты перыяд не існавала дзяржавы і адзінай палітычнай улады з акрэсленым цэнтрам. Магчыма, грамада несла кругавую паруку ў адносінах да самой сябе ці

суседняй абшчыны, аднак тады гэта ўяўляла сабой простую сялянскую салідарнасць. Дадзеная тэорыя даволі цікавая, але патрабуе пільнай увагі і пэўнай дапрацоўкі. Зараз гэтую думку падтрымліваюць сучасныя ўкраінскія даследчыкі І. Бойка і М. Бедрый. Яны не вельмі абгрунтавана сцвярджаюць, што копныя суды на Галічыне ўтварыліся ў XIV ст. шляхам трансфармацыі мясцовых верхных судоў[27].

Пятае меркаванне з'яўляецца карэкціроўкай гіпотэзы М. Любаўскага, якую выклаў Ф. Леантовіч[28], а далучыліся да яе А. Яфіменка[29] і І. Чаркаскі[30]. Нараджальніцай копаў, лічылі даследчыкі, стала натуральная суседская салідарнасць і ўзаемная адказнасць, якая існавала паміж жыхарамі адной грамады. У інтарэсах кожнага селяніна было тое, каб усе суседзі ў форме капы дапамаглі яму ў выпадку нейкага здарэння або злачынства. У сваіх ранніх даследаваннях Ф. Леантовіч значна перабольшваў уплыў «старажытнарускай» прававой традыцыі на зараджэнне капы, атаясамліваў «коны» (землі) і звод Рускай Праўды, чэшскія асады і старажытнарускую верв з мясцовымі копнымі зборкамі[31]. Аднак пазней, праз 47 гадоў пасля першай сваёй працы, якая закранала дадзенае пытанне, аўтар змяніў свае погляды і адмовіўся ад ранейшых пазіцый. Цяпер даследчык лічыў пачаткам паходжання сходу суседскую салідарнасць. На жаль, з прычыны сваёй смерці навуковец не змог працягнуць пачатыя ім новыя распрацоўкі. Арыгінальнай з'яўляецца думка А. Яфіменка аб дадзяржаўнай прыродзе і часе паходжання ўстановы, нагадваючы, што kuopa перакладаецца з літоўскай мовы як родавая грамада. Такім чынам, з'ява копнага сходу – гэта прыроднае ўтварэнне, а не навязаны штучны элемент паўсядзённага грамадскага жыцця. У сваю чаргу, Р. Лашчанка даволі штучна і без аналізу крыніц сінтэзаваў дадзеную думку з пазіцыяй М. Іванішава, беспадстаўна сцвярджаў, што копны суд з'явіўся раней за дзяржаву[32].

Уласная аўтарская пазіцыя наступная: тэорыю аб вечавым паходжанні капы неабходна сінтэзаваць з наяўнасцю суседска-тэрытарыяльнай салідарнасці ў сялянскім асяроддзі, не выключаючы пэўнай магчымасці ўплыву прававой традыцыі і практыкі часоў Рускай Праўды. Менавіта гэтыя тры галоўныя складнікі і сталі асновай будучай судовай установы. Страціўшы палітычныя і эканамічныя функцыі, веча захавала сваю мясцовую судовую дзейнасць і бягучую працу па ўладкаванні грамадскага гаспадарчага жыцця. Такое эвалюцыянаванае веча ў поўнай меры спярша задаволіла як вышэйшыя колы дзяржавы, для якіх сход стаў дапаможным мясцовым органам судовай улады, так і просты сялянскі люд, які бачыў у капе сапраўдную абарону і падтрымку падчас пэўных цяжкасцей і звычайных жыццёвых спраў. Копны сход з упэўненасцю можна назваць «судовым вечам». П. Куліш вельмі каларытна назваў капу «вечам без князя, асірацелым вечам», у нейкім сэнсе з ім можна пагадзіцца[33].

Копны суд не з'яўляўся выключна судовай установай у адрозненне ад іншых судоў ВКЛ, а быў універсальным інстытутам падтрымання грамадскага парадку з шырокай кампетэнцыяй: удала спалучаў дзейнасць гаспадарчага, паліцэйска-следчага, судовага, справаводчага і выканаўчага органаў, якой ахопліваў амаль усе сферы жыцця тагачаснага чалавека. На працягу XVI ст. адбываецца інтэграцыя капы як установы вуснага права ў дзяржаўную ўрадавую сістэму пісьмовага кадыфікаванага права, што паказвае гарманічнасць і паралельнасць развіцця, а таксама ўзаемнае ўзбагачэнне гэтых дзвюх складовых частак прававой культуры краіны. Капа стала своеасаблівым праобразам і прататыпам інстытута суда прысяжных на нашых землях, што сведчыць аб яе вялікім дэмакратычным унёску ў прававую культуру Беларусі.

[1] Гл.: Ю х о  І. А. Копныя суды старажытнай Беларусі // Юстыцыя Беларусі. 1999. № 4 (7). С. 55.
[2] Гл.: Г о л у б е ў  В. Ф. Сельская абшчына ў Беларусі XV–XVIII стст. Мн., 2008. С. 77.
[3] Гл.: Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею. Т. XVIII. Акты о копных судах. Вильна, 1891. № 58, 90, 91.
[4] Гл.: Г о л у б е ў  В. Абшчынны (копны) суд у сістэме судовага ладу Беларусі XVI–XVIII стст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. № 1. С. 24.
[5] Гл.: T y s z k i e w i c z  E. Badania archeologiczne nad zabytkami przedmiotow sztuki, rzemiosl i t. d., w dawniey Litwie I Rusi Litewskiey, z tablicami rycin na kamieniu rznetemi. Wilno, 1850. S. 41–45.
[6] Гл.: Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: У 6 т. Т. 2. Протарэнесанс і Адраджэнне. Мн., 2010. С. 177–182.
[7] Гл.: З е н к о в и ч  А. Ф. О местном суде в XV–XVI вв. на Подляшье. План г. Вильны 1648 года. Вильна, 1914. С. 4–7.
[8] Гл.: Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссиею. СПб., 1846. Т. I. № 148.
[9] Я с и н с к и й  М. Н. Материалы для истории судоустройства и судопроизводства в Литовско-Русском Государстве. Акты о копных и панских судах. Т. I. 1501–1588. Киев, 1897. № 324.
[10] Гл.: Ч е р к а с ь к і й  І. Громадськй (копній) суд на Україні – Русі XVI–XVIII вв. // Праці комісії для виучування історії західно-руського та вкраїнського права. Київ, 1928. Вип. 4. С. 64.
[11] Гл.: Г о л у б е ў  В. Ф. Сельская абшчына… Мн., 2008. С. 79.
[12] Русская правда / Под ред. А.И. Яковлева. М., 1914. С. 20–21.
[13] Гл.: Г о л у б е ў  В. Абшчынны (копны) суд… С. 24.
[14] Гл.: Г о л у б е ў  В. Ф. Сельская абшчына… С. 76.
[15] Гл.: Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею… С. 24.
[16] Там жа. № 9–30.
[17] Гл.: Ч е р к а с ь к і й  І. Указ. тв. С. 35.
[18] Гл.: Ш к я л ё н а к  М. В. Беларусь і суседзі: Гістарычныя нарысы. Беласток, 2003. С. 203.
[19] Гл.: Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею… С. 22; С п р о г и с  И. Я. Древний народный копный суд в Северо-Западной Руси. Витебск, 1895. С. 3–5.
[20] Гл.: Ш к я л ё н а к  М. В. Указ. тв. С. 200–201.

[21] Там жа. С. 201.
[22] Гл.: Демченко Г.В. Притомные люди и копная сторона // Варшавские университетские известия. 1899. № 5. С. 14.
[23] Гл.: Любавский М.К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута: Ист. очерки. М., 1893. С. 659–660.
[24] Гл.: Шкялёнак М.В. Указ. тв. С. 202–203.
[25] Гл.: Иванишев Н.Д. О древних сельских общинах в Югозападной России. Киев, 1863. С. 5.
[26] Гл.: Любавский М.К. Указ. тв. С. 655.
[27] Гл.: Бойко І.Й., Бедрій М.М. Копні суди в селах українського (руського) права Галичини у XIV–XVIII ст. [Электронный ресурс]. Львів, 2009. Режим доступа: http://www.nbuv.gov.ua/portal/Soc_Gum/Nvlduvs/2009_1/09bijux s.pdf. Дата доступа: 04.05.2010.
[28] Гл.: Леонтович Ф. Областные суды в Литве // Журнал министерства юстиции. 1910. № 9-10. С. 94–95.
[29] Гл.: Ефименко А.Я. Народный суд в Западной Руси (Исторический очерк) // Русская мысль. 1893. Кн. 8. Отд. 2. С. 9–10.
[30] Гл.: Черкаській І. Указ. тв. С. 47–51.
[31] Там жа. С. 4.
[32] Гл.: Лащенко Р. Копні суди на Україні, їх походження, компетэнція і устрій // Збірнік правничої комісії при історично-фільософічній секції наукового товариства імени Шевченка. Львів, 1925. Вип. 1. С. 1–6.
[33] Гл.: Кулиш П.А. История воссоединения Руси. Т. I. От начала колонизации опустошенной татарским погромом Киево-Галицкой Руси до начала столетней крестьянско-шляхетской войны. СПб., 1874. С. 154.

Паступіў у рэдакцыю 06.09.11.

***Дзяніс Сяргеевіч Буцін*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Ю.Л. Казакоў.